**II (раённы ) этап рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры, 2011/2012 н. г.**

**Комплексная работа**

**ДАВЕДКІ І КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ**

**9 клас**

*** Заўвага! За кожную арфаграфічную, пунктуацыйную, граматычную і іншыя памылкі пры афармленні адказу рэкамендуецца здымаць па 0,1 бала пры станоўчай ацэнцы задання.**

**** Пры ацэньванні работ прапануецца строга прытрымлівацца прапанаваных крытэрыяў.**

| Заданне і даведкі да яго | Крытэрыі ацэнкі |
|---|---|
| <u>**1 заданне**</u> | <u>**Максімальная колькасць балаў – 10.**</u> |
| 1.1. *Узмакрэлы і босы,*<br>*Бронзавы ад загару,*<br>*Стомлены сенакосам,*<br>*Ліпень прылёг памарыць.*<br>*Мёдам на ўсю Еўропу*<br>*Пахнуць стагі і копы.* | 0,5 бала за правільна запісаную вершаваную страфу;<br>1,5 бала за правільна пастаўленыя знакі прыпынку (па 0,5 бала за кожную коску). |
| 1.2. Увасабленне (метафара) (*ліпень прылёг памарыць*),<br>эпітэты (*узмакрэлы і босы, бронзавы ад загару, стомлены сенакосам*),<br>параўнанне (*мёдам ... пахнуць стагі і копы*),<br>гіпербала (*пахнуць на ўсю Еўропу*). | 2, 5 бала.<br>Па 0,5 бала за кожны ўказаны мастацкі троп. |
| 1.3. <u>*Узмакрэлы і босы,*</u><br><u>*Бронзавы ад загару,*</u><br><u>*Стомлены сенако*</u><br><u>*Ліпень*</u> <u>*прылёг*</u> <u>*памарыць.*</u> | 2 балы.<br>(- 0,5 бала за кожнае няправільна падкрэсленае слова). |
| *Сказ просты, двухсастаўны, поўны, развіты, ускладнены аднароднымі адасобленымі азначэннямі.* | 2,5 бала.<br>Па 0,5 бала за кожную правільна ўказаную пазіцыю. |
| 1.4. *Дзеяслоў-выказнік перад дзейнікам атрымлівае дадатковую сэнсавую і выяўленчую нагрузку, узмацняецца вобразнасць верша.* | 1 бал. |
| <u>**2 заданне**</u><br>*Ёлка* – 1*)* дрэва хвойнай пароды з кароткай іглiцай;<br>2) елка, ссечаная і ўпрыгожаная к святу Новага года;<br>3) прыслоўе ад прыметніка *ёлкі* – прагорклы, з непрыемным рэзкім пахам (пра нясвежыя тлушчы).<br>*Чарніца* – 1) адз. лік да *чарніцы* – саладкаватыя чорна-сінія ягады кустовай расліны сямейства брусні́чных;<br>2) ж. р. да *чарнец* – (уст.) манах. | <u>**Максімальная колькасць балаў – 5.**</u><br><br>Па 0, 5 бала за кожнае правільна ўказанае значэнне. |

**3 заданне**

*а)* **Настаў-ніц-а**, астатнія словы ўтвораны пры дапамозе суфікса -ІЦ-;

*б)* **А-багаціць,** у астатніх словах прыстаўка -АБА-;

*в)* **Снопавяза-лк-а,** у астатніх словах словаўтваральны суфікс -К-;

*г)* **Піхтоў-нік**; астатнія словы маюць два суфіксы: -Н-, -ІК-;

*д)* **Каласіцца** ўтворана суфіксальна-постфіксальным спосабам, астатнія – постфіксальным.

**Максімальная колькасць балаў – 10.**
Па 1 балу за кожнае правільна выбранае слова;
па 1 балу за кожны правільна аргументаваны выпадак.

**4 заданне**

| *Е* | *Ё* |
|---|---|
| *таЕжны* | *ГалалЁдзіца* |
| *камбайнЕр* | *чацвЁрты* |
| *манЕўр* | *мЁдаварэнне* |
| *цЕшча* | |
| *шлЕм* | |
| *таЕмны* | |
| *аднаймЕнны* | |

**Максімальная колькасць балаў – 5.**

Па 0, 5 бала за кожнае правільна аднесенае слова.

**5 заданне**

*1 – В, 2 – Е, 3 – Д, 4 – З, 5 – Б, 6 – А, 7 – Ж, 8 – Г.*

**Максімальная колькасць балаў – 4.**
Па 0,5 бала за кожную правільна суаднесеную пару.

**6 заданне**

а) **ТАК:** пасля цвёрдых і зацвярдзелых гукаў літара І не пад націскам абазначае гук [Ы];

***б)* ТАК:** [ісланцы] 8 л., 7 г., [пайіхн’аму] 8 л., 9 г., [адынсул’ту] 10 л., 9 г., [нарэцы] 7 л., 6 г., [л’эдз’в’э] 7 л., 5 г.;

***в)* НЕ:** Камен-ны – марфалагічнае падваенне (на стыку кораня і суфікса).

**Максімальная колькасць балаў – 6.**
Па 2 балы за кожны правільны адказ.
Тлумачэнне дадаткова не ацэньваецца.

**7 заданне**

| | |
|---|---|
| ***Назвы абрадаў і свят*** | Грамніцы, улазіны, дажынкі |
| ***Назвы прадметаў інтэр’ера*** | куфар, зэдлік, выцінанка |
| ***Назвы традыцыйнага адзення*** | бурнос, кабат, панёва |
| ***Назвы абутку*** | апоркі, пасталы, шнуроўкі |
| ***Назвы галаўных убораў*** | аблавуха, брыль, намітка |
| ***Назвы страў нацыянальнай кухні*** | верашчака, дранікі, узвар |
| ***Назвы прылад працы*** | жорны, нерат, абцугі |

**Максімальная колькасць балаў – 8.**
-0,5 бала за кожнаеняправільна аднесенае слова.

**8 заданне**

**а) Назавіце №№ цытат з аднаго тэксту** 1,2;
**б) Як называецца твор?** “Сымон-музыка”;
**в) Укажыце яго жанр.** Паэма;
**г) Хто яго аўтар?** Якуб Колас;
**д) Назавіце сапраўднае імя аўтара** Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч;
**е) Хто аўтар трэцяй, не звязанай з вызначанымі ў папярэдніх заданнях, цытаты?** Янка Купала (“Магіла льва”);
**ж) Назавіце імя галоўнага героя гэтага твора.** Машэка

**Максімальная колькасць балаў – 7.**

Па 1 балу за кожны правільны адказ.

**Максімальная колькасць балаў – 55 балаў.**